**УДК 82.09 (476)**

# «ДРЫГВА» ЯКУБА КОЛАСА
# Ў КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАГА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА ПРАЦЭСУ

***канд. філал. навук А.П. НІЯКОЎСКАЯ, С.Я. КАЧАРАГІН***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Аповесць «Дрыгва» аналізуецца як чарговы этап пошукаў беларускім народам свайго шляху ў новых гістарычных умовах. Асабіста падкрэсліваецца актуальнасць аповесціў кантэксце сучаснага гісторыка-культурнага працэсу.*

Шмат пісалася і гаварылася аб падабенстве двух твораў славя нскай эпічна-рамантычнай паэзіі - маюцца на ўвазе паэмы «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча і «Новая зямля Я. Коласа. Але паэма Я. Ко л аса не проста нарадзілася пад уплывай вялікага земляка. Дзеі абедзвюх паэм паказваюць пакуты нараджэння (ненараджэння?) беларуска-літоўскай дзяржаўнасці (А. Міцкевіч) і сацыяльна адказнага, суб 'ектна-адзінкавага чалавека-беларуса (Я. Колас). Паэмы аб’ядноўвае не толькі супольная духоўная прастора. Адным і тым самым паветрам дыхаюць героі А. Міцкевіча і *Я.* Коласа, тую ж ваду п’юць, жывуць пад тымі ж сузор’ямі на той самай зямлі... Толькі так мы можам зразумець шматлікія рэмінісцэнцыі, скразныя архетыпічныя вобразы. Адным з такіх скразных вобразаў з’яўляецца ў паэм ах наш «прарадзіцель» Воўк, татэмны звер германа-балцкага яшчэ паходжання. У А. Міцкевіча тэта «жалезны Воўк», якога прысніў князь Гедзімін. Воўк як пачатак Вільні («Воўчага места»), як сімвал будучай славы літоўскай дзяржавы. У А. Міцкевіча гэта ўстаўны эпізод («...ukofysany marzyi o wilku Zelaznym...») [1, с. 99], як тэта ўласціва рамантычнай традыцыі. У неарамантычнай паэме Я. Коласа Воўк, сам канаючы (пагібель татэма?), хоча перадаць сілу галоўнаму герою, каб той знайшоў асабіста-адказны лёс, жыццёвы шлях. Воўк праходзіць праз усю паэму «Новая зямля». Ён заўсёды побач з героямі, якія шукаюць спосабу «людзьмі звацца» (так, купалаўскае...). Я. Колас прадбачыць трагічны лёс нашага народа на гэтым шляху. Згадаем, што «Новая зямля» мае як бы дзве канцоўкі:

У полі, полі
Пры дарожачцы
Пахіліўся крыж
Над магілаю.
Беглі сцежачкі
У свет шырокенькі
Прывялі яны
К той магіланцы! [2, с. 334].

Але не можа Колас на гэтай менавіта ноце скончыць сваё апавяданне. Апошнія радкІ паэмы даюць надзею на будучае:

Ой вы, дарожанькі людскія,
Пуцінкі вузкія, крывыя!
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Вас горне шлях прасторнай плыні
І далягляд ружова-сіні,
Дзе так панадна свеціць сонца,
Дзе думка тчэ свае красёнцы,
Каб новы свет жыцця саткаць,
Заспакаенне сэрцу даць
І разагнаць яго трывогі!.,
Прасторны шлях! Калі ж, калі
Ты закрасуеш на зямлі
І злучыш нашы ўсе дарогі? [2, с. 334].

* * *

Спроба паказаць чарговы этап пошукаў свайго шляху беларускім народам - тэта аповесць «Дрыгва». Твор дзіўны, нібыта звычайны «савецка-кананічны», але разлічаны на вельмі ўдумлівага чытача. Перш за ўсё, аўтар у аповесці займае вельмі цікавую пазіцыю. Я. Колас разважае над лёсам, над шляхам народа. У «Новай зямлі» сэрца пісьменніка білася ў такт з сэрцамі ягоных землякоў. У «Дрыгве» нават няўласна-простая мова сустракаецца не вельмі часта. Тэкст ад аўтара насычаны лексемамі, зусім не ўласцівымі мо-

ве герояў. Вельмі часта тэта словы і выразы газетныя, а таксама з будзённага ўжытку будучых чытачоў «Дрыгвы»: «Я мушу... зазірнуць у Вепры, каб сталі яснымі гэтыя пытанні» (21); «Былі слаўныя вечары іх блізкасці і дружбы» (26); «Партызаны-разведчыкI сабралі дужа важных звестак аб размяшчэнні часцей польскага войска, аб яго канцэнтрацыі» (85); «Матывы асабістага парадку хілілі яе ў процілеглы Васілю бою> (99); «Аўгіня, як і бабка Наста, спалохалася, што залішне сказала. У выніку, як у алгебры мінус на мінус дае плюс...» (101); «Гэтыя ж падзеі падымалі дух працоўнага сялянства» (126); «...прынцыпы арганізацыйнага парадку...» (129); «ён покі што і надалей захоўваў сваё Інкогніта...» (31). I гэта Колас - вытанчаны стыліст, які на тых самых старонках чула рысуе чароўную нашу прыроду, прысвячае светлыя радкі Прыпяці, лесу, лугам... Не, тут нешта не так. Аповесць нездарма называецца «Дрыгва». Гэты «новояз», звязаны з жудаснымі падзеямі, з парушэннем традыцыйных адносін, - ці не частка ўсеагульнай «дрыгвы», ці не падкрэслівае Колас гэтымі выразамі няпэўнасць чалавечага жыцця ў пераломны час? Бо пераход да новага гэта заўсёды перарыў паступовасці - альбо ўзвышэнне, альбо падзенне... Якуб Колас уступав ў нейкую змову з чытачом, разам з ім дыстанцыруецца ад гэтых падзей, каб лепш іх зразумець.

Уважлівы чытач «Дрыгвы» вылучае ў гэтым творы тры, па меншай меры, «пласты» апавядання.

Першы «пласт» - вонкавы, гэта пласт гістарычнага факту. Але дзея нават не апісваецца, часцей замяняецца рэакцыяй на яе. Гэта - дзея аднадзёнка, прычым Колас наўмысна таропка пералічвае асобныя падзеі, карыстаючыся амаль даслоўнымі цытатамі з афіцыйнага ідэалагічнага друку, прамоў, палітычных спрэчак. Менавіта барацьба беларускіх партызанаў у саюзе з Чырвонай Арміяй супраць «белапалякаў» здаецца асноўным зместам твору. Гэта давала і дае мажлівасць лічыць «Дрыгву» чарговым творам на тому рэвалюцыі і станаўлення савецкай улады на Беларусі Гэта першы, вонкавы «пласт» твору, дадзены даволі ўмоўна, часам «плакатна».

Другі «пласт» твору - розныя праявы чалавека ў новых, ваенных умовах, калі гіне традыцыйны лад жыцця, калі тэмп гэтага жыцця трагічна прыспяшаецца, не прыносячы спакою, патолі, пэўнасці. Коласаўскія палешукі прадчуваюць свой выход з «лесу да Лёсу». Гэтая тэма ў «Новай зямлі» яшчэ не мае такога шырокага гучання, яшчэ не з'яўляецца жыццём. На самой справе пераўтварэнне «тутэйшага», палешука, які жыў, «як усе», у сучаснага чалавека, адказна-грэшную асобу - справа трагічная, нават крывавая. У першым «пласце» аповесці постаці жаўнераў войска польскага і чырвонаармейцаў дадзены даволі схематычна. Другі ж «пласт» прысвечаны лёсу нашага народа. Таму й разгортвае Колас шырокую панараму адносін паміж вяскоўцамі-палешукамі, укінутымі ў вір вайны, разгубленнымі перад аблічча м няведамай будучыні. Першая сусветная вайна ўскалыхнула Палессе, беручы новыя ахвяры, уздымаючы хвалі чалавечага гора, надзей, жахаў. I прырода не можа засланіць, як калісьці, сваіх дзяцей, бо яны вымушаны яе пакінуць. Працягваецца тэма Новай зямлI, новай прасторы: з лесу - да Лёсу! Да Лёсу, але праз пакуты людабойства, разбурэнне традыцыйных асноваў жыцця... Вайна, рэвалюцыя, ізноў вайна... Рабаванне, недавер, варожасць, смяротныя сутычкі... Людзі, пазбаўленыя традыцыйнага ладу жыцця, губляюць старую маральнасць... Прызвычаеныя да жыцця ў лесе, палешукі вучацца жыць у новых умовах: «На людзях трэба быць такім жа асцярожным, як і на балотнай дрыгве: ступні не так - і праваліўся» (6). Колас паказвае дэградацыю людзей, пазбаўленных сувязі з глыбокімі асновамі быцця, - Не забіваюць палешукі сваіх канвойных-палякаў, бо няма ў іх, простага люду, паняцця аб забойстве людзей. Але па меры разгортвання дзеі выраз «весці ў расход» робіцца ў іх вуснах амаль звычным: забіваюць палякаў, забіваюць аднавяскоўцаў, нават сваякоў... Агульначалавечая мараль разбураецца: «Букрэй катэгарычна асуджаў грабежніцтва на вайне, але ўзяць у ворага тое, што табе канешне патрэбна ў баявым жыцці, дазваляецца» (71).

Трэці, найбольш глыбокі «пласт аповеду» - велічна-бязгрэшнае, нетаропкае жыццё прыроды. Менавіта яе апявае Я. Колас у шматлікіх лірычных адступленнях. У ёй, прыродзе, жыў чалавек-беларус традыцыйным «тутэйшым жыццём». З яе ён павінен ісці ў шырокі свет, ствараючы сваё індывідуальнае, нацыянальнае аблічча. ПІсьменнік паказвае, што гэты шлях не абміне наш народ, але ён, гэты шлях не можа быць безахвярным, бяскроўным, роўным, як воды палескіх азёраў. Але куды ідуць людзі? Ці разумеюць яны стыхійнасць сацыяльных звышсілаў, якія змагаюцца за душу чалавека, вырашаюць лёсы народаў? Тут Колас выступав як сапраўдны майстар. Ён паказвае развіццё розных чалавечых тыпаў, прадказваючы мажлівае будучае багацце тыпалогіі асобы. Але як захаваць чалавечнасць у новых умовах? «Што будзе далей? Дзед Талаш чутка прыслухоўваецца да шуму лесу, да ўсхліпвання хваляў шырокай Прыпяці... Далечы маўклівых балот тояць штосьць невядомае, вострае і цікавае» (6). Прырода перасцярагае людзей, але і пасылае ім выпрабаванні, нібы выпрбоўваючы іх на людскасць. Дзеі адбываюцца на тле прыроды, у лесе, на ПрыпяцI, што, «як у зачараваным сне, утуліўшыся ў балоты... нясе... сваю багатую даніну (4)». У сё адбываецца на тле Вечнасці У Вечнасць уключаны гістарычны, чалавечы час. I нашы ўчынкі вымяраюцца іх уплывам на Вечнасць прасторы і часу. Чалавек падсвядома ўскладае свае надзеі на стыхійныя сілы жыцця, спрадвечныя пачаткі быцця, сувязь з якімі ён не павінен губляць. Колас шукае апірышча - сацыяльнага, маральнага - у спрадвечных каштоўнасцях, якія захоўвае родная зямля. Людзі, укінутыя ў ненажэрны вір гісторыі, несвядома змяняюць свае погляды. У прыроду - бязгрэшна-велічную -

урываюцца людскія жарсці, страшныя і непрымірымыя. Родная прастора - не толькі тло, але і ўдзельніца жыцця і акно ў Сусвет. Яна ж дае магчымасць усёведання, усёбачання. Архетыпы свядомасці, звязаныя з прыродай, ахоўваюць герояў ад маральнага разбурэння. Выходзячы з прыроды, чалавек не павінен губляць з ёй сувязі. Архетыпы гэтыя захоўваюць глыбінны вобраз «прабацькі», татэма. Але на новым, індывідуальным узроўні жыцця гэтыя вобразы калектыўнага несвядомага захавае толькI той, хто дбае пра народ I зямлю. Глыбінны вобраз прабацькі праяўляецца ў аповесці часам як выпадковая прымаўка, нейкі сімвал, часам рэальны факт, што мае не да канца ўсвядомлены сэнс.

В ось таму і з'яўляецца на старонаках «Дрыгвы» Воўк. - У небяспецы, якая пагражае народу, ажыўляецца архетыпічны вобраз.

Пераход чалавека на новы, індывідуальна-асабовы ўзровень жыцця вельмі цяжкі. Воўк як падсвядомы архетыпічны калектыўны вобраз уключае чалавека ў касмічнае адзінства, прымушае яго адчуць прыналежнасць прыродзе і Роду. Татэм павінен дапамагчы людзям перайсці ў новую якасць, даўшы ім сваю сілу, сваё аблічча. Набыўшы якасці татэмнага звера, лягчэй прайсці гэты рубеж і, галоўнае, вараціць сабе зноў чалавечае аблічча. Гэта перавярценьства дапамагае чалавеку перажыць, прайсці нечалавечае, адмовіўшыся ад традыцыйнага, «ляснога» ладу жыцця.

Воўк уваходзіць у аповесць спакваля, паволі, па меры таго, як ускладняецца жыццё людзей - ягоных нашчадкаў, родзічаў. Спачатку дзед Талаш абяцае выць па-воўчы тры разы (як у «Новай зямлі» - эпічныя тры разы!), каб на гэты знак да яго выйшаў Мартын Рыль. На адной старонцы кнігі Воўк згадваецца шэсць разоў (два разы па тры!). Ці гэта не падсвядомая просьба аб дапамозе? Дзед Талаш выклікае Ваўка! А потым - вельмі важная (ці не кульмінацыйная?) сцэна ў лесе: Талаш забівае Ваўка. Але перад гэтым Воўк забівае вепра, а вепр нішчыць мурашнік. Няяснае, трывожнае Нешта прымушае Талаша задумацца. Так, мурашкі не разумеюць, што сталася з іх жытлом, не адчуваюць, што над імі пранесліся магутныя стыхійныя сілы. Ці не яшчэ больш магутная сіла выгнала дзеда і тысячы працавітых людзей з хат, прымусіла іх падняць руку на бліжняга?

Талаш забівае Ваўка. Згадаем, што ў «Новай зямлі» Міхал Ваўка не забівае - Воўк гіне ў палонцы, перадаўшы Міхалу свой апошні высілак - каб той здолеў знайсці асабісты лёс, не адмаўляючыся ад традыцыйнга ладу жыцця, не выходзячы з прытульнага, свойскага лесу. Але Міхал памірае, перадаўшы брату запавет «жыць нанова». Ужо ў «Новай зямлі» адчуваецца патрэба новай міфалагемы (як калісьці на беразе Віліі, дзе Гедзімін сасніў Жалезнага ваўка- сімвал сілы і славы літвінаў). У «Дрыгве» - развіццё гэтай патрэбы. Пагібель Ваўка - пачатак новага светаадчування, новага стаўлення да сябе і свету. Ці гатовыя людзі да гэтага? Але людзI ніколі не гатовыя да новага, яно заўсёды вырывае іх з прывычнага кругабегу жыцця. Дзед Талаш носіць на сабе сырую воўчую скуру, нездарма называе сваіх паплечнікаў «мае ваўкі» (85). Тройчы вые ён ваўком, заклікае сваіх «ваўкоў» на тую сцягу, якая вызначана архетыпам (абарона, дапамога). Воўк, ужо забіты дзедам Талашом, працягвае ахоўваць сваіх родзічаў: воўчая скура грэе дзеда, на воўчай скуры ўтульна параненаму Панасу. «Гэта табе воўчая скура здароўя дае» (83), - кажа Панасу Нупрэй. Але Воўк ужо забіты. Працяг кульмінацыі твору (ягонага несвядомага «падмурку») - сон дзеда Талаша. У сне на дзеда напаў страшны воўк. «Злосць падшыбла дзеда, закруціў ён яшчэ раз ваўка, ... аж воўк адарваўся, у дзедавых руках застаўся толькі яго хвост, а сам воўк паляцеў у снег. Пазірае дзед Талаш - а са снегу замест ваўка падымаецца Панас, глядзіць на бацьку засмучанымі вачыма і гаворыць: «За што ты б'еш мяне, тата?» (72).

Шлях з безасабовасці да трывожна-індывідуальнага выбару і адказнасці - цяжкі. У крывавых сутычках героямі Коласа падсвядома кіруе жаданне напоўніць сваё Існаванне сацыяльнасцю, уключыцца ў нейкую новую структуру, параадолеўшы безасабовасць. Аўтар паказвае, як жыццё яго герояў на пэўнай стадыі траціць сваю «натуральнасць», традыцыйную сістэмнасць. Аповесць «Дрыгва», як і «Новая зямля», пачынаецца апісаннем велічнай красы нашага роднага краю. У гэтую веліч упісваецца чалавек, якога прырода зберагае. У «Новай зямлі» (як, дарэчы, і ў «Пане Тадэвушу» А. Міцкевіча) - канфлікт паміж Лёсам і асабістай здольнасцю чалавека абраць свой асабісты шлях. Гэты канфлікт не вырашаецца. У абедзвюх паэмах - налружанае чаканне, прадчуванне будучых падзей. У абедзвюх паэмах паказана падсвядомае Імкненне вырвацца з замкнёнага кола. Гэта - пагібель-нарадзіны, амбівалентная, трывожная дзея, расцягнутая ў часе. У паэмах «Пан Тадэвуш» і «Новая зямля» яшчэ няма выразнага матыву катастрофы. У аповесці «Дрыгва» *Я.* Колас паказвае ўваход народа ў найбольш катастрафічны перыяд жыцця. Усе сферы сацыяльна-касмічнага існавання чалавека - канцэнтрычныя, У цэнтры - чалавек, які адну за адной адчыняе гэтыя супарадкаваныя, сузалежныя сферы. Кожны такі «прарыў» у соцыум - шлях праз пакуты, блуканне, пагібель і нарадзіны, пераход у новую якасць, новы свет. У «Дрыгве» людзі не толькі пакідаюць сферу, якую пільнуе Прабацька-Воўк, але і забіваюць яго. Яны павінны прайсці стадыю «распаду» суб'екта. (Між іншым, характар супраціўлення гэтаму распаду, якасць гэтага супраціўлення - адно з азначэнняў культуры).

Пасля смерці Ваўка людзі застаюцца сам на сам з Лёсам. Індывідуальны лёс - неабходнасць, непазбежнасць. Чалавек павінен стаць інстытутам для самога сябе. Але героі Адама Міцкевіча і Якуба Ко-

ласа ў згаданых паэмах яшчэ не губляюць цалкам арганічнага ўспрымання наваколля. А ў аповесці «Дрыгва» - смутны час, нараджэнне новага гістарычнага ладу пазбаўляе чалавека тоеснасці з прыродай і гісторыяй. Чалавек не можа пазнаць таямніцу самога сябе, выйсці за межы фізічнага свету - таму што ваўкалацтва мажліва толькі пры ўмове тоеснасці з прыродай. Гэтыя разважанні не здаюцца нам залішнімі, бо ў даследаванні мастацкага твору неабходны ўлік «тэлеалагічных» прынцыпаў. Прыпавеснасць, лірыка-драматычны роздум у рамках пабытовага аповеду, арыентацыя на першапачатковыя, архетыпічныя канстанты чалавечага і прыроднага быцця (дом, агонь, вада, смерць, свет продкаў, дарога, лес, жывёльны свет і інш.) — утвараюць, як ужо згадвалася, асобны «пласт» мастацкага твору, які можа быць зразуметы толькі «сваім» чытачом. Такі чытач зразумее ў канкрэтным, нават пабытовым аповедзе, універсальны сэнс і аналогіі. Такі чытач убачыць у творах А. Міцкевіча і Я. Коласа адтварэнне глыбінных міфа-сінкрэтычных структур мыслення (сумяшчэнне розных часоў і прастораў, «перавярценьства» герояў, наўмыснае парушэнне прычынна-выніковых сувязяў і г.д.) [3, с. 204]. Пагібель Ваўка ў «Дрыгве» нібыта вырывае галоўнае звяно з міфа-санкрэтычнай структуры. Як ужо гаварылася, падсвядомасць стварае ў такіх сітуацыях новыя міфалагемы, каб ўратаваць народ ад пагібелі.

У аповесці «Дрыгва» ёсць вельмі выразны, найбольш старажытны архетыпічны вобраз. Гэта - Прыпяць, Рака-Час. Вобраз Прыпяці праходзіць праз усю аповесць. Велічнае апісанне Ракі-Часу ў пачатку аповесці - адначасова і прадказанне будучай «смуты» і трагедыі: бурлівыя хвалі ўздымае вецер на спакойнай рацэ. Прыпяць «голасна ўсхліпвае..., як маці ля магілы, дзе пахаваны яе дзеці...» (5). Разліў Прыпяці, шырокі, як неабсяжнае мора, сімвалізуе будучае нараджэнне «новай вады», «новага рэчышча». Гэта - патрабаванне новага жыцця. Новае рэчышча старога архетыпічнага вобразу запаўняецца пасля паводкі-вайны «новай вадой». Але пасля забойства Ваўка новая міфалагема ўжо не дае месца чалавеку ў Сусвеце. Гэта міфалагема «нізкага неба», яна прымушае чалавека існаваць у адной плашчызне. Гэта - не прастора, але лакалізацыя існавання. Лакальнасць, лакалізацыя прадугледжвае канкрэтныя факты, «эмпірыку» акрэсленага дзеяння паасобнага героя, «дадзенасць» мясцін. Прастора ж мае характар духоўны, сімвалічны [4, с. 254]. З пагібеллю татэма прастора ператвараецца ў лакальнасць, час вымяраецца працягласцю існавання сацыяльнага факту. Пустое рэчышча архетпічнага вобраза запаўняецца «вадой» гістарычна абмежаванай, няпэўнай, нячыстай. Адным словам, дрыгва. Дзеда Талаша выбіраюць партызанскім атаманам. Але гэты вобраз не адпавядае архетыпу. Бо архетып праз архетыпічныя вобразы нясе ахову, дабрыню, а вайна - з'ява, варожая гэтай першааснове. Праявы мясцовага патрыятызму («тутэйшасць») не сінергуюцца ва ўсвядомленую нацыянальную ідэю. Але чалавек не можа пазбавіцца ўплыву архетыпічнага вобраза (Воўк у «Дрыгве»). Больш за тое, сігналы стыхійнага несвядомага могуць успрымацца скажона і не даюць чалавеку мажлівасці стаць самадастатковай асобай. Бо асоба, пазбаўленая першавытокаў быцця, абавязкова, непазбежна будзе растоплена масаю. А месца першавытокаў быцця, займаюць іншыя структуры: ідэалогія дзяржаўнай улады, тэхнічны прагрэс і г.д.

К.Г. Юнг пісаў: «Згубленасць свядомасці ў сучасным свеце вынікае... са згубы інстынкту» [5, с. 46 - 47]. Чалавек, выходзячы з прыроды пачынае забываць свае архаічныя першавытокі. Згубленасць, разгубленасць свядомасці - дрыгва, якую людзі не могуць перамагчы, каб жыць, бо «каб у нашым сучасным жыцці захаваць прыток інстыктыўных сілаў, - а гэта вельмі неабходна для захавання нашага быцця, - неабходна знайсці адпаведныя патрабаванням сучаснасці ўяўленні для нашых архетыпічных вобразаў» [5, с. 38]. Але як выразіць тое, аб чым крычыць душа? Як знайсці вобраз-сімвал, адпаведны новаму часу? Як знайсці надзею на мэтазгоднасць жыцця і бессмяротнасць? Чым жа кампенсуецца неўладкаванасць і раздробленасць новага жыцця?

Калі ў «Пане Тадэвушу» і «Новай зямлі» аўтары ставяцца да ўласнага тэксту сублагічна, пачуццёва «пражываючы» ўласны тэкст, у «Дрыгве» толькі ў першых раздзелах мы адчуваем магутны подых Вечнасці. Далей пачынаецца тое, аб чым ужо згадвалася.

Забойства татэма - Ваўка - нясе людзям згубу касмічнасці існавання. Ці не аб гэтым гаварыў К.Г. Юнг: «Мы жывем у перыяд, калі богі змяняюць свой вобраз, гэта значыць у эпоху змянення асноўных прынцыпаў і сімвалаў» [5, с. 24]. Уратаванне архетыпічна-міфалагічнай сутнасці гэтых прынцыпаў і сімвалаў залежыць ад чалавека, ад «якасці» яго містычнага пазнання.

М. Бердзяеў пісаў, што містычнае пазнанне - гэта не справа цвярозага розуму. Інтуітыўна прадугадваючы з'явы, чалавек як бы рэалізуе ўласную прыроду [6, с. 499]. У. Джэймс у сваім творы «Многообразие религиозного опыта» дае чатыры адзнакі містычных перажыванняў:

1) нявыказанасць (немажлівасць выказаць) уражанні і адчуванні на звычайнай мове, таму што містычнае перажыванне не мае аналагаў у зямным жыцці, яно не мае асновы ані ў розуме, ані ў пачуццях;
2) інтуітыўнасць. Гэта моманты ўнутранага прасвятлення, азарэння;
3) кароткачасовасць;
4) бяздзейнасць волі, бо воля знаходзіцца ва ўладзе вышэйшай сілы.

Усе гэтыя характарыстыкі датычаць і сну Гедзіміна (у «Пане Тадэвушу» А. Міцкевіча), і «пера-вярценьства» Міхала, і матываў дзеяння дзеда Талаша (у творах Я. Коласа «Новая зямля» і «Дрыгва»). Скажэнне здольнасці містычнага пазнання дэміфалагізуе свет «Дрыгвы», Прастора, межы якой сцеражэ Воўк, - раскрытая. Гэтую прастору павінна заняць новая міфалагема. Але людзі яшчэ не здольны яе адтварыць. І ў сакральныя межы ўрываецца міфалагема «нізкага неба» і «плоскай зямлі», прасякнутая і народжаная разбуральнай ідэалагічна-палітычнай логікай факту і момантy.

Міфалагізацыя мае характар інтуітыўны, я на нараджаецца спакваля, суправаджаецца аўтарскімі рэмаркамі, нават іроніяй, нібы губляецца ў падкрэслена простых сюжэтных хадах, якія, тым не менш, маюць міфалагічную аснову [3, с. 224]. Гэта мы назіраем і ў А. Міцкевіча, і ў Я. Коласа.

Нараджэнне новага міфу - у новай рэфлексіі не столькі героя (ён дзейнічае несвядома), колькі аўтара, у яго пазіцыі адначасова і ўдзельніка, і назіральніка. Гэта датычыць усіх трох згаданых твораў. Але, на нашу думку, найбольш аўтарскага «назіральніцтва» у «Дрыгве». Таму і карыстаецца Я, Колас (асабліва ў апошніх частках твору) ідэалагічна-палітычным «новаязом»; ён нібы дыстанцыруецца ад таго, што робіцца з яго героям і (каб «новай моваю» паказаць «новыя ўмовы»?).

«Пан Тадэвуш» і «Новая зямля» маюць касмічныя вытокі, суцэльную эпічную прастору, межы якой ахоўвае стары татэм. У «Дрыгве» Я. Колас паказвае згубу касмічнасці, Напрыклад, смерць у «Новай зямлі» - з'ява каемічнага характеру ці-то памірае чалавек, ці-то памірае звер. У новай міфалогіі, нараджэнню якой прысвечаная «Дрыгва», няма павагі ані да смерці, ані да жыцця: «Войта Васіля Бусыгу ў «расход» вывелі. (202). «Адвечныя» тэмы: прырода ў яе красе, прыгажосць і драматычнасць кахання, чалавечнасць... Я. Колас паказвае ў «Дрыгве», як «драбнеюць» гэтыя вечныя тэмы. Чалавек у сваім жыцці не можа ўзняцца над гістарычна, часава-прасторава абмежаванымі фактамі.

У адным з апошніх раздзелаў аповесці Я. Колас паказвае дачку партызанскага камандзіра Мартына Рыля. На магіле «свайго сапраўднага бацькі» дзяўчынка ганарліва ўздымае галаву. «Несапраўдны бацька», паслугач багацеяў, ужо атрымаў сваё. А двое дзетах, для якіх тэты чалавек быў сапраўдным бацькам? Якое ім жыццё наканавана? А іх - усіх траіх - «сапраўдная матка»? Як яна будзе з гэтым жыць далей? Я. Колас піша вельмі стрымана, апісваючы вонкавыя праявы дзеі. - Сёння ж мы чытаем гэтыя старонкі са спозненым жахам: «Людцы, а што ж гэта такое? Ці гэта магчыма?» Якуб Колас дачакаўся, нарэшце, свайго чытача.

У паэмах «Пан Тадэвуш» і «Новая зямля» аўтары паказваюць разбурэнне міфалагічнай мадэлі свету, гэта значыць разрыў сувязяў чалавека з прыродай, «выхад» з яе. Гэта - пачатак «асобы псіхалагічнай». Разбурэнне старой мадэлі свету працягваецца і ў аповесці «Дрыгва». Працягваецца пакутлівы шлях індывідуальнага разумения свету. Можна акрэсліць гэты працэс як пачатак «вылузвання» чалавека як асобы з прыроды сацыяльнай, утварэнне «сацыяльнай асобы». І мы бачым гэты складакы, пакутлівы шлях. Архетыпічная сіла губляе свае вобразы, яна пазбаўляецца руху, забіваецца «логікай факту», рацыянальным стаўленнем да жыцця.

Архетыпічныя сімвалы-вобразы паміраюць, замяшчаюцца, марнеюць, занепадаюць. Бо нараджэнне і смерць міфаў - праекцыя калектыўнага несвядомага.

Колас паказвае, што людзі, якія насяляюць ягоную аповесць у страшны час чалавеказабойства, не страцілі да канца агульначалавечай маральнасці, ПісьменнІк распавядае аб праявах чалавечнасці ў адносінах паміж вяскоўцамі і польскімі жаўнерамі. Як ужо згадвалася, палешукі не знішчылі сваіх канваіраў, раззброіўшы іх, бо агульначалавечае залатое правіла маральнаці жыве ў душы кожнага народа. Так, лёс казаў змагацца палешукам з польскімі жаўнерамі. Але польскі вартавы сваёю воляю выпушчае Панаса (сына дзеда Талаша) з астрогу. І гэта змушае зірнуць на польскіх жаўнераў іншымі вачыма - вачыма агульначалавечага спачування. Спачування ўсім людзям, якім лёс казаў змагацца паміж сабою.

Пачуццё агульначалавечага нарадзілася яшчэ ў часы першабытнасці, Яно жыве ў нас падсвядома нават у тыя часы, калі гісторыя супрацьпастаўляе народы і людзей. Касмічнае пачуццё сусветнай суцэльнасці, прыналежнасці да Сусвету ў свой, асабовы, адметны спосаб... Толькі з такога пачуцця вырастае нацыянальная ідэя.

Колас не можа стрымаць свайго захаплення польскімі танцам і ў палацы Длугошыца (хоць часам і хавае гэтае захапленне за пагардлівай усмешкай) (107). Засмучаецца ён, калі піша з вялікім жалем (хоць з адрабінай наўмыснай сентыментальнасці) аб лёсе «стройнай бландынкі», кавалер якой, «прыгожы, чарнявы афіцэр» добра граў на фартэп'яна і так трагічна загінуў (69): «Стройная бландынка, забіўшыся ў куток, з сардэчным болем і смуткам думала аб тым, як порстка і няпэўна шчасце на свеце, а вобраз прыгожага маладога афіцэра-музыканта, як жывы, стаяў у яе вачах...» (69).

Я. Колас апісвае ваенную сутычку ў лесе: палешукі - супраць польскіх жаўнераў. Засада. Жаўнеры разгублена кінуліся ўрассыпную, гінуць, Колас парушае ідэалагічныя каноны, ён піша аб гераічным учынку паручніка Жыгалкоўскага - польскага афіцэра, які страляў да апошняй мінуты (218). Апісанне ідзе «ад аўтара», і мы можам здагадвацца, што адчувае Я. Колас - жаль, смутак, адчай, любоў, павагу да жывых і мёртвых.

Не, нялёгка забіць чалавека. Хто забіў, той праз усё жыццё пранясе жудасны ўспамін. Колас украпвае ў сваю аповесць радкі аб захаванні агульначалавечага. - Вось дзед Талаш пасля забойства польскага жаўнера: «... першае, што ён адчуў і што потым доўга не забывалася, гэта быў хруст разбітага Ім чэрапа *незнаёмагаяму* чалавека» (135) (выдзелена намі *-А. Н., С. К).* Чалавека, які асабіста нічога дрэннага яму, Талашу, не зрабіў...

І нечым жудасным паты хае з тых старонак, дзе Цімох Будзік паліць панскі палац. Так, вайна - не школа маральнасці. Забіўшы вялікага, хударлявага Ваўка, дзед Талаш і ягоныя аднавяскоўцы шукаюць новай асновы трываласці свету... Праз знішчэнне свету старога?

...Пасля паводкі Прыпяць зноў запаўняе сваё рэчышча. Час ідзе з вадою. Але гэтая вада - ці тая самая, якую несла Прыпяць, «утуліўшыся ў балоты»? Ці гэта тая самая «багатая даніна» усяму свету і роднай зямлі? «Новая вада» прасякнутая болем, жорсткасцю, яна - ужо не мае касмічнага адпаведніку, яна ўся - «тутэйшая». Так, рэчышча старога архетыпічнага вобразу падмяняецца. Новая міфалагема не дае месца чалавеку ў Сусвеце. Яна замыкав чалавека пад нізкім небам на плоскай зямлі.

Жыццё, якое павінна наступіць, толькі дэкларуецца пісьменнікам у наўмысна казённа-ідэалагічных выразах: «... Ідзе сюды новы, савецкі чалавек, каб парушыць іх (балотных купін - *А. Н, С. К.)* зняменне, каб абярнуць іх у багатыя нівы і лугі» (222). Зноў Колас як быццам бы «адчужае» сябе казённа-ідэалагічным вы разам (нібы з газетнай бапонкі тых часоў) - ад таго, што ён піша. Дзед Талаш, сын Прыпяці і сuродзіч Жалезнага Ваўка, плыве ў чаўне па рацэ («Рака-час»), прыціскаючы да сябе... партфель упаўнаважанага старшыні сельсавета. Ён - «вінцік» новай дзяржаўна-грамадскай структуры. Плыве разам з асабістым сакратаром!!! Так, гэта гратэск, спалучэнне жудаснага з камічным!

Але ёсць яшчэ надзея на адраджэнне Вялікага Ваўка: «Удумліва пазіраюць кудысь углыб, відаць, у *мінулае* (выдзелена намі *-А.Н., С. К),* яго цёмныя, яшчэ жывыя і вострыя вочы»[34],

Аповесць, аднак, не скончаная. Я. Колас пакідае мажлівасць яе працягу. На апошняй яе старонцы дзеду Талашу «восемдзесят з хвосцікам». «Ён - вартаўнік на Прыпяці. Яго работа - даглядаць і запальваць ліхтары ванач» (222). Ліхтары - як воўчыя вочы... Не ўпільнаваў, не ўратаваў, і ліхтары заліло чорнай вадой. А можа, сапраўды адзавецца Вялікі Воўк? А можа, І адазваўся, але мы не пачулі, не ўбачылі за мігаценнем дзён і постацяў. Не пачулі і не ўбачылі ані гол асу, ані аблічча...

## ЛІТАРАТУРА


1. Adam Mickewicz. Pan Tadeusz. - Czytelnik, 1974.
2. Якуб Колас. Новая зямля. - Мн.: Народная асвета, 1975. Далей цытаты з «Новай зямлі» прыводзяцца па гэтаму выданню з указанием старонак ў круглых скобках.
3. Литературный энциклопедический словарь. - М., 1987.
4. Herman Mayer. KsztaKowanie przestrzeni i symbotika w sztuce narracyjnej. Pamietnik literacki. - Warszawa, 1970. - Z. 3.
5. Юнг К.Г. Современность и будущее. - Мн., 1992.
6. Бердяев Н.А. Философия свободы. Смысл творчества. - М., 1989.